жр 3240 07/277

Библиотека АН БССР

# С новым годом, товарищи!

Смерць нямецкім акупантам!

ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН БАРАНАВІЦКАГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 1 (202) Субота, 1 студзеня 1944 г.

Сёння споўнілася 25 год з дня стварэння Беларускай ССР.

НЯХАЙ ЖЫВЕ БЕЛАРУСКАЯ СОВЕЦКАЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА!

## БЕЛАРУСЬ БЫЛА І БУДЗЕ СОВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІКАЙ



Сёння, 1 студзеня 1944 г., споўнілася 25 год са дня стварэння Беларускай дзяржавы — Беларускай ССР. Толькі дзякуючы Вялікай Окцябрскай Соцыялістычнай Рэволюцыі, толькі дзякуючы кіраўніцтву большэвіцкай партыі беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць, стаў гаспадаром сваёй зямлі. Тварцамі і арганізатарамі нашай беларускай совецкай дзяржавы з'яўляюцца вялікія правадыры народаў Ленін і Сталін.

Беларускі народ пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі ў годы грамадзянскай вайны адстаяў сваю маладую рэспубліку. З дапамогай вялікага рускага народа з беларускай зямлі былі выгнаны нямецкія разбойнікі, польскія і другія захопнікі, якія насягнулі на наша багацце, на нашу зямлю.

За годы совецкай улады беларускі народ дабіўся бурнага расквіту сваёй гаспадаркі, культуры і ўздыма свайго матэрыяльнага дабрабыту. У Мінску, Віцебску, Гомелі, Магілеве і другіх беларускіх гарадах былі пабудаваны буйныя прамысловыя прадпрыемствы. Звыш 20 вышэйшых навучальных устаноў працавала ў Беларусі, якія выпусцілі многатысячную армію інтэлігенцыі—настаўнікаў, інжынераў, урачэй, аграномаў і т. д.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна беларускі народ ажыццявіў сваю адвечную мару—беларускія землі былі з'яднаны ў адзінай Беларускай Совецкай Дзяржаве.

На багацце нашага народа, на яго свабоду і жыццё зноў насягнулі нямецка-фашысцкія разбойнікі. Больш двух гадоў яны церзаюць Беларусь. Віселіцамі, расстрэламі і пажарамі немцы хацелі запалохаць, паставіць на калені наш народ. Але не выйшла гэта. Магутнае полымя всенароднай партызанскай вайны разгарэлася па ўсёй нашай роднай зямле. Ва ўсіх кутках Беларусі дзейнічаюць совецкія патрыёты—народныя мсціўцы—партызаны. Совецкая Беларусь жыве і змагаецца. У гэтай свяшчэннай барацьбе супроць нямецкіх захопнікаў беларускі народ яшчэ больш умацаваў дружбу з вялікім рускім народам, яшчэ цясней згуртаваўся вакол большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна.

25 гадавіну сваёй рэспублікі беларускі народ сустракае ва ўмовах жорсткай барацьбы за поўнае ачышчэнне совецкай зямлі ад нямецкай нечысці. Ідзе масавае выгнанне нямецкіх ізвергаў з прадзелаў нашай радзімы. Чырвоная Армія вызваляе ад немцаў нашу рэспубліку

(Працяг на 2 стар.)

## Беларусь была і будзе Совецкай Рэспублікай

(Пачатак на 1 стар.)

Беларусь. Часці Чырвонай Арміі ўжо занялі абласны горад Гомель і амаль усю Гомельскую вобласць, 9 раёнаў Магілеўскай вобласці, 5 раёнаў Палескай і 4 Віцебскай вобласці. Яны перарэзалі чыгунку Віцебск—Полацк, падыходзяць з поўначы к Полацку, выйшлі на захадні бераг Беразіны, на Прыпяці падыйшлі к Мозыру.

Мільёны беларусаў і беларусак ужо вызвалены Чырвонай Арміяй ад нямецка-фашысцкага іга. Недалёк той дзень, калі чырвоны сцяг свабоды ўзаўецца і над гарадамі і вёскамі нашай Баранавіцкай вобласці.

Аднак, барацьба за поўнае ачышчэнне нашай краіны ад нямецкіх мерзаўцаў патрэбуе вялізарнага напружання ўсіх сіл народа. Трэба ўзмацніць удары па тылавых нямецкіх камунікацыях, аказваючы тым самым дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі.

Адступаючыя нямецкія зладзеі да ніткі грабяць усё на сваім шляху, забіраюць ці знішчаюць дабро, здабытае доўгагадовай працай нашага народа, забіваюць ці ўганяюць на нямецкую катаргу нашых людзей. Таму важнейшая задача насельніцтва — выратавацца ад знішчэння гітлераўскімі зверамі і ўгона ў нямецкую няволю, сарваць праводзімую немцамі „татальную" мабілізацыю, выратаваць ад аграблення і знішчэння сваю маёмасць.

Усе, хто здолен насіць зброю, павінен уставаць на ўзброеную барацьбу супроць немцаў. Доўг кожнага чэснага чалавека—аказваць усямерную дапамогу слаўным партызанам.

Усенароднай вызваленчай барацьбой паскорым час свайго вызвалення, выратуем сваю зямлю ад апусташэння гітлераўскімі зверамі!

Беларусь была і будзе свабоднай Совецкай Рэспублікай.

Смерць нямецкім акупантам!

## Красная Армия развивает наступление

(Из оперативных сводок Совинформбюро с 25 по 30 декабря 1943 г.)

В течение последней недели части Красной Армии на Витебском направлении продолжали успешно развивать наступление. С 25 по 30 декабря они освободили от немецких оккупантов свыше 300 населённых пунктов и среди них Кабак, Шуньки, Жеребычи, Белянки (25 км. северо-западнее Витебска) Гайдуки, Хомяково, Белыновичи, Яськово, Стугрово (13 км. восточнее Витебска), Сверчки, Мятли, Мисники, ж.-д. станция Крынки, Новосёлки, Дворище, Худяки, Шухвосты, Триливки, Козлы, Короли, Лосвида, Баровня, Угляны и др. Нашими войсками перерезаны шоссейная и железная дороги Витебск—Полоцк.

Войска 1-го Украинского фронта, перейдя в наступление на Житомирском направлении, прорвали оборону немцев и за 6 дней упорных боев к исходу 29 декабря, продвинулись вперед от 50 до 100 км., расширили прорыв до 300 км. по фронту. В ходе наступательных боев наши войска разбили восемь танковых дивизий немцев, среди которых танковые дивизии СС „Адольф Гитлер" и „Райх" и четырнадцать пехотных дивизий. В результате успешного наступления войска фронта овладели городом и крупным железно-дорожным узлом КОРОСТЕНЬ, городами ВОЛОДАРСК-ВОЛЫНСКИЙ, ЧЕРВОНОАРМЕЙСК, ЧЕРНЯХОВ РАДОМЫШЛЬ, КОРОСТЫШЕВ, городом и важнейшим железно-дорожным узлом КАЗАТИН, городом СКВИРА и заняли свыше 1000 других населенных пунктов.

В ознаменование одержанной победы наиболее отличившиеся в боях соединения и части, а также отличившийся командный состав представлены к награждению орденами.

30 декабря, в 22 часа столица нашей Родины Москва салютовала доблестным войскам 1-го Украинского фронта, прорвавшим оборону немцев,—двадцатью артиллерийскими залпами из 224 орудий.

В излучине Днепра западнее города Запарожье наши войска перешли в наступление и с боями заняли более 60 населенных пунктов.

Севернее Кировограда наши войска успешно отбивали атаки крупных сил пехоты и танков противника и нанесли ему большие потери в живой силе и технике.

## МИТИНГ в городе ГОМЕЛЕ

26 декабря в гор. Гомеле состоялся митинг, в котором приняли участие жители города и колхозники из близ лежащих сел и деревень. На трибуне—руководители областных и городских советских, партийных и общественных организаций, представители командования Белорусского фронта.

На митинге выступил генерал-лейтенант Телегин, секретарь Обкома партии тов. Жиженков, начальник штаба Гомельского соединения партизанских отрядов тов. Бабыкин и другие.

Тов. Бабыкин сообщил в своем выступлении, что за два с половиной года партизаны гомельщины сбросили под откос 769 немецких жел.-дор. эшелонов, сожгли и подорвали 767 автомашин противника, уничтожили 149 км. линии связи, 418 жел.-дор. и шоссейных мостов, 33 склада с боеприпасами и имуществом, истребили около 7000 немецких солдат и офицеров.

С огромным воодушевлением участники митинга приняли приветствие Верховному Главнокомандующему Маршалу Советского Союза тов. Сталину. Были приняты приветствия ЦК КП(б)Б и Командующему Белорусским фронтом генералу армии Рокоссовскому.

(ТАСС).

# АДЗНАЧЫМ 25 ГАДАВІНУ БЕЛАРУСКАЙ ССР
# узмацненнем удараў па нямецка-фашысцкіх акупантах!

## У адважных падрыўнікоў

Падрыўнікі атрада імені Жданава пад кіраўніцтвам палітрука Ч. мінай ўзарвалі чыгуначны эшалон на адной з чыгунак на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці. Узрывам разбіт паравоз. 11 вагонаў і 1 платформа з ваеннай тэхнікай зляцелі пад адкос. Рух на чыгунцы спынен на двое сутак.

* * *

К фронту рухаўся нямецкі цягнік. Група партызан з атрада „Першамайскі" пад кіраўніцтвам камандзіра ўзвода Г. замініравала чыгунку. Цягнік наляцеў на міну і ўзарваўся. Паравоз і 15 вагонаў з танкамі і гарматамі зляцелі пад адкос. Пад іх абломкамі загінула 13 гітлераўцаў.

* * *

За 15 дзён снежня падрыўнікі партызанскага атрада імені Суворава, якім камандуе Міхаіл К., скусцілі пад адкос 4 нямецкія воінскія эшалоны. Пры крушэннях разбіта 19 вагонаў, з іх 7 з жывой сілай ворага, а так сама 3 платформы.

Удачна дзейнічала група пад кіраўніцтвам А. С. Яна ўстроіла крушэнне цягніка з войскам праціўніка, які ішоў к фронту. Пад адкос зляцела 7 вагонаў. Каля 150 фрыцаў знайшлі сабе магілкі, недаехаўшы да фронта. Значная колькасць фашысцкіх салдат і афіцэраў паранена.

Другая група пад кіраўніцтвам П. Д. устроіла крушэнне цягніка з нямецкім войскам, які ішоў на захад. Разбіта 5 вагонаў з тэхнікай і 2 з жывой сілай. І тут 73 нямецкія захопнікі не ўнеслі ногі з нашай зямлі. Яны забіты пры крушэнні цягніка, а 38 гітлераўцаў убраліся пакалечанымі.

## Не дадзім праходу акупантам

Група партызан Камсамольскага атрада пад кіраўніцтвам В. Б. у пачатку снежня ўзарвала 55-мятровы мост праз раку на важнай дарозе. Цэлы тыдзень немцы будавалі яго нанава. А як толькі работы былі скончаны і па дарозе зноў мог аднавіцца рух, тыя-ж партызаны непрыкметна для нямецкай варты падабраліся да моста і спалілі яго.

Тая-ж група партызан некалькі разоў нанасіла ўдары па лініях сувязі нямецкіх акупантаў. Адзін раз была знішчана тэлефонна-тэлеграфная лінія на працягу 2,5 км., другі раз на працягу 3 кіламетраў.

## Разагналі нямецкіх грабіцелей

У вёсцы № была трывога. З мінуты на мінуту тут са страхам чакалі нямецкага грабіцельскага атрада, які абрабаваў суседнія вёскі і рухаўся сюды. З другога боку ў вёску падаспелі партызаны атрада „За Совецкую Радзіму". Даведаўшыся аб намерах немцаў, партызаны рашылі выратаваць сялян ад аграблення.

Як толькі немцы прыблізіліся да вёскі, партызаны ўступілі ў бой з імі. Негледзячы на колькасны перавес немцаў, партызаны, пад камандаваннем камандзіра атрада Ілы С., смела атакавалі іх і пачалі цясніць.

На дапамогу адважным народным мсціўцам паспяшыла група партызан з атрада імені Суворава, якім камандуе Іосіф К. Яна зрабіла засаду на шляху адыхода немцаў.

Нямецкія грабіцелі, не вытрымаўшы партызанскага ўдарк з фронта і тылаў кінуліся ў беспарадку бегчы, кідаючы награбленае дабро. Партызаны забілі 10 і ранілі 15 немцаў, захапілі мінамёт, 800 мін, аўтамат, патроны і многа дабра, награбленнага немцамі ў сялян. Яго партызаны звярнулі гаспадарам.

Міх. Ч.

# ЦІ-Ж МОЖНА ДАРАВАЦЬ?

На атлогім беразе быстраводнай Іслачы, сярод высакшага на карні бур'яна сіратліва стаяць печкі. Іх доўгія, нібы жураўлінныя шыі, каміны, абгарэўшыя чыгункі ды іншыя хатнія рэчы сведчаць аб трагедыі, якая насцігла гэта месца.

Тут калісьці жылі людзі—тут была вёска Белы Бераг. Пры совецкай уладзе ў Белым Беразе працавала школа, у якой вучыліся дзеці некалькіх акаляючых вёсак, тут быў лесапрамгас. Людзі тут апрача сельскай гаспадаркі мелі добрыя заработкі і жылі ўдастатку.

У жыхароў Белага Берага была свая гордасць: пасылаючы свайго прадстаўніка ў вышэйшы орган совецкай улады—у Вярхоўны Совет СССР выбаршчыкі Юрацішкаўскага раёна выбралі дэпутатам белабярэжскую сялянку Марыю Чэрнік. Яна, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР жыла і працавала ў Белым Беразе.

Так было да нашэсця гітлероўскіх орд на нашу зямлю.

Нямецка - фашысцкія захопнікі залілі нашу родную беларускую зямлю руччамі крыві і слёз. Не мінула фашысцкая навала і Белага Берага.

Нібы драпежныя звяры ўварваліся ў вёску каты гестапо. Яны зверскі расцярзалі народнага дэпутата Марыю Чэрнік і чатырох другіх мірных, ні ў чым не вінаватых сялян. Астатняе насельніцтва вёскі выратавалася, схаваўшыся ў лясных гушчарах. Гітлераўскія мярзаўцы да ніткі абрабавалі вёску, а потым спалілі яе да тла. Як і Белы Бераг яны спалілі Расолішкі, Сябрыкі І і ІІ, Юроўск і дзесяткі другіх вёсак Юрацішкаўскага раёна.

Дымам ад пажарышч было закрыта неба, кругом раздаваліся стогны, ліліся руччы слёз аграбле-

(Працяг на 4 стар.)

## ЗА ГРАНИЦЕЙ

### Назначение в составе верховного командования союзников

В Лондоне опубликовано правительственное сообщение, в котором говорится, что генерал Эйзенхауэр назначен верховным союзным главнокомандующим английскими и американскими экспедиционными войсками, организующимися в Соединенном Королевстве для освобождения Европы.

Верховным союзным главнокомандующим на Средиземноморском театре назначен генерал Вильсон, главнокомандующим союзными армиями в Италии—генерал Александер, главнокомандующим английской армейской группой, находящейся под верховным командованием генерала Эйзенхауэра, назначен генерал Мантгомери, командующим американской бомбардировочной авиацией, оперирующей против Германии, назначен генерал Спатс.

### Потоплен германский линкор

В Лондоне официально объявлено, что у мыса Нордкап (северное побережье Норвегии) потоплен германский линкор „Шарнгорст“.

В сообщении английского морского министерства говорится: „Во второй половине дня 26 декабря корабли английского морского флота под командованием адмирала Фрейзера, прикрывавшие корабли, направляющиеся в Россию, вступили в бой с германским линкором „Шарнгорст“. „Шарнгорст“ был потоплен у мыса Нордкап.

Линкор „Шарнгорст“ водоизмещением в 26.000 тонн вступил в строй в конце 1936 года. Его команда состояла из 1461 человека.

### За 7 месяцев на Германию сброшено 100.000 тонн бомб

За период с 23 мая по 24 декабря 1943 года на Германию было сброшено 100 000 тонн бомб. Столько же тонн бомб было сброшено на Германию за время с 1940 г. по 1943 г.

### ВОЕННЫЕ ДЕЙСТВИЯ В ЮГОСЛАВИИ

По полученным из Югославии сведениям, части югославской народно-освободительной армии по прежнему сохраняют инициативу во всех секторах военных действий.

В восточной Боснии между Кладань и Живница продолжаются ожесточенные бои. В Санджике югославские части продвинулись вперед. В секторе Луано—Ливно ожесточенные бои продолжаются.

## ЦІ-Ж МОЖНА ДАРАВАЦЬ?

(Пачатак на 3 стар.)

ных і разораных людзей.

Ці-ж гэта можна забыць, ці-ж гэта можна даравацьнямецкім мерзаўцам?

...З таго часу на месце Белага Берага на папялішчах сярод бур'янаў і стаяць адзінокія печкі. У іх камянах вецер свішча бясконцыя песні жалобы, песні бязлітаснай помсты нямецкім злодзеям, якія разбурылі гэты ўтульны куток, якія прынеслі смерць і пакуты нашаму народу. На гэтую свяшчэнную помсту немцам узняліся белабярэжцы, сябрынцы—узняўся ўвесь беларускі народ. І сёння лепшыя перадавыя сыны і дочкі беларускага народа—партызаны і партызанкі сустракаюць новы 1944 год баявой вахтай—у дазорах, на засадах, на падрыве нямецкіх чыгуначных эшалонаў, аўтамашын.

За сваю чэсць і свабоду, за Савецкую ўладу народныя мсціўцы сёння, у дзень 25 годдзя Беларускай Дзяржавы, нанясуць новыя ўдары па нямецкіх тылах і тым самым наблізяць час вызвалення роднай беларускай зямлі ад нямецкага ярма.

Я. Белабярэжскі.

## ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

### Навагоднія падарункі фронту

15 вагонаў харчавання і цёплых рэчаў адправілі франтавікам у падарунак к Новаму Году жыхары Свярдлоўска.

Чацверты Украінскі фронт атрымае падарункі з Кабардзіна-Балкарыі.

Тысячы індывідуальных падарункаў падрыхтавалі жыхары Магнітагорска байцам і афіцэрам падшэфнага Гвардзейскага танкавага корпуса. Гвардзейцы, якія вызначыліся ў баях, атрымаюць залатыя гадзіннікі.

Калгаснікі Нагорнага Карабаха накіравалі на фронт пасылкі з сушанымі фруктамі, вінамі, з шэрсцянымі рэчамі.

Колькасць падарункаў, якія прыбываюць на фронт з усіх канцоў краіны, з кожным днём узрастае.

(ТАСС.)

### 1.000 трактараў сабралі работнікі МТС Харкаўшчыны

У час акупацыі немцы зраўнялі з зямлёй многія машынатрактарныя станцыі Харкаўскай вобласці. Толькі ў 20 МТС асталіся кой-якія моцна пашкоджаныя будынкі.

Сіламі работнікаў МТС вобласці ўжо сабрана звыш 1.000 трактараў і вялікая колькасць другіх сельска-гаспадарчых машын. 45 МТС ужо маюць памяшканні.

### *Літаратурныя вечары у Арле*

У Арле аднаўляецца літаратурнае жыццё, створана літаратурная група. На яе занятках абмеркавана новая аповесць арлоўскага пісьменніка Горбава „Мирные жители“, расказы і вершы пачынаючых паэтаў і пісьменнікаў. Адбыўся агульнагарадскі літаратурны вечар.

Рэдкалегія.